*Дар'я Абрамовіч*

# ДЗВЕ МАРЫІ

Я нарадзілася і жыву ў вёсцы, якую вельмі люблю. Люблю за яе прыгажосць, за незвычайна цікавыя мясціны, пра якія складзены легенды – помнікі традыцыйнай культуры майго народа. Люблю за тое, што людзі маёй вёскі, якая называецца Старая Мётча, захоўваюць памяць пра сваіх продкаў, захоўваюць даўнія традыцыі і навучаюць ім нас, маладых, каб і мы помнілі свае карані.

Для мяне прыкладам такой памяці з'яўляецца мая сям'я. Я ў сям'і малодшая. Старэйшы брат, Сяргей, служыць у войску. Мая мама, Кудзіна (дзявочае прозвішча) Таццяна Рыгораўна, 1970 г.н., родам з вёскі Навасады. Яна прыехала ў Мётчу працаваць у магазіне і тут пазнаёмілася з маім татам, Абрамовічам Міхаілам Міхайлавічам, 1969 г.н. Ён працуе ў падраздзяленні МНЗ. Мы жывём у звычайным вясковым доме, але лепшага за яго няма ў цэлым свеце. Не толькі таму, што мы ўсе разам ствараем у ім утульнасць і падтрымліваем парадак. А яшчэ і таму, што побач з намі жывуць нашы блізкія родзічы – татавы сёстры з сем'ямі, і заўседы мы ўсе дапамагаем адно аднаму ва ўсіх жыццёвых праблемах. А самае галоўнае – па суседству з намі жыве наша дарагая бабуля, татава мама, Абрамовіч Марыя Елісееўна.

Мне здаецца, што я ведаю яе з першых дзён свайго жыцця. Разам з мамай і татам яна заўсёды побач са мной. Яе цеплыні і любові хапае на ўсю нашу вялікую сям'ю. Але жыццё яе было нялёгкім.

Нарадзілася яна 14 кастрычніка 1943 года ў суседняй вёсцы Селішча ў сям'і сельскіх працаўнікоў, Касцюковічаў Кацярыны і Елісея. Напэўна, па традыцыі і ёй дастаўся цяжкі працоўны лёс. Бабулі было ўсяго 13 год, калі яна пасля заканчэння 7-мі класаў пайшла працаваць у саўгас і аддала гэтай нялёгкай працы амаль дзесяць гадоў. У 1963 годзе пайшла вучыцца на прадаўца. Адвучыўшыся год, Марыя вярнулася дадому
і пачала працаваць у краме.

У гэты час у Мётчу вярнуўся мясцовы прыгожы хлопец, Абрамовіч Міхаіл Міхайлавіч, які да гэтага часу скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум і адслужыў у арміі. Пазнаёміўшыся, Міхаіл і Марыя больш не разлучаліся. Яны ўступілі ў шлюб, і ў 1967 годзе ў іх нарадзілася дачка Іна (такое рэдкае на той час для вёскі імя даў дзіцяці мой дзядуля). Пасля на свет з'явіўся мой тата, якога па спадчыне таксама назвалі Мішам, а затым і трэцяе шчасце – малодшая дачушка Ганначка (зараз яе называюць Ганна Міхайлаўна, яна працуе настаўніцай у нашай школе). Але за вялікім шчасцем у дружную працавітую сям'ю прыйшло вялікае няшчасце: 28 ліпеня 1989 года ад цяжкага захворвання лёгкіх памёр мой дзядуля, і бабулі давялося адной паднімаць на ногі ўсіх сваіх траіх дзетак. Але яна не толькі трымала гаспадарку, карміла і вучыла дзяцей, але яшчэ і спраўна працавала ў саўгасе. З 1973 па 1998 год бабуля займала вельмі адказную і складаную пасаду – была загадчыцай заправачнай станцыі. Таму і вясковы псеўданім у бабулі - Маня Запраўшчыца.

Я думаю, што пераадолець жыццёвыя цяжкасці бабулі дапамаглі таксама яе родзічы і сябры. Радню нашу называюць у вёсцы Лазовым кустом. Раней я не разумела значэння гэтага выразу. А зараз ведаю: гэта таму, што ў нашым раду багата каранёў і галін, таму што ўсе вельмі дружныя і заўсёды робяць усе цяжкія вясковыя справы талакой, г.зн. разам, дапамагаючы па чарзе адно аднаму. А яшчэ мне было вельмі цікава ў 6 класе прачытаць у падручніку па беларускай літаратуры паданне «Лазовы куст», і з гэтага часу я ўяўляю нашага далёкага, агульнага для ўсёй радні продка, які настойлівай працай заснаваў наш родны кут. Можа, пагэтаму рэдка хто з нашай радні жыве далёка ад нашай Мётчы.

Мая радня збіраецца разам не толькі ў час працы. Мы ўсе разам святкуем сямейныя і народныя святы, спраўляем хрэсьбіны і вяселлі, разам адзначаем сумныя даты. У такія дні побач з маёй бабуляй заўсёды яшчэ адзін чалавек, які даўно стаў усім нам раднёю.

Я невыпадкова назвала сваё выступленне «Дзве Марыі». Другая Марыя – даўняя сяброўка маёй бабулі – гэта для Мядоцкага краю жанчына-легенда, таму што яна паказала ўсім, што для чалавека, які ўмее і любіць працаваць, няма перашкод.

Марыю Ціханаўну Абрамовіч (як бачыце, у сяброўак супадаюць не толькі імёны, але і прозвішчы!) ведаюць па ўсёй Барысаўшчыне як жанчыну-трактарыстку і як дэпутата, спачатку мясцовага, затым раённага, а пасля і Вярхоўнага савета СССР. Ёй у вёсцы таксама «прысвоілі» псеўданім: Маня Дэпутатка.

Дэпутацкі перыяд жыцця Марыі Ціханаўны быў насычаны разнастайнымі падзеямі і вялікімі клопатамі. У перыяд з 1989 па 1990 гады яна ўдзельнічала ў рабоце чатырох з'ездаў народных дэпутатаў СССР. 1-ы з'езд праходзіў 25 мая-9 чэрвеня 1989 года, 2-гі – 12-24 снежня 1989 года, 3-і нечарговы – 9-15 сакавіка 1990 года і 4-ы – 17-27 снежня 1990 года. У час знаходжання ў Маскве ў 1989 годзе Марыя Ціханаўна была на прыёме ў Генеральнага сакратара ЦК КПСС Міхаіла Сяргеевіча Гарбачова, размаўляла з ім і як дэпутат шмат чаго зрабіла для мясцовай гаспадаркі. У яе доме ў маленькай вёсачцы Ярцаўка ў 1990 годзе гасцяваў таксама былы кіраўнік нашай дзяржавы Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч.

Але не гэтым праславілася Марыя Ціханаўна і не за гэта любяць і паважаюць яе людзі. Яна нарадзілася 21 лістапада 1944 года ў суседняй вёсцы Вяляцічы. Сям'я была вялікая – шасцёра дзяцей. Закончыўшы Вяляціцкую школу, пайшла працаваць на цагельны завод. У 1962 годзе выйшла замуж у вёску Аскеркі Мётчанскага сельскага савета за Абрамовіча Уладзіміра Антонавіча. Сваю ўласную хату маладыя вырашылі будаваць далёка ад цэнтральнай сядзібы саўгаса – у вёсцы Ярцаўка, за 3 кіламетры ад цэнтральнай сядзібы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нарадзіліся у іх адна за адной тры дзяўчынкі. Але маладая маці не пашкадавала сябе, а вырашыла стаць трактарысткай. Гадуючы дзяцей, Уладзімір і Марыя працавалі механізатарамі – з ранку да вечара. Ды не проста працавалі, а самааддана, таму што адчувалі вялікую любоў да зямлі і павагу да працы земляроба. А дзяўчаты-дочкі падрасталі, дапамагалі ў хатніх справах, станавіліся сапраўднымі гаспадынямі. Затым закончылі школу, уладкаваліся на працу, выйшлі замуж, нарадзілі сваіх дзетак. І заўсёды апорай і падтрымкай для іх былі бацька і маці. Старэйшая, Тамара, жыве ў Маскве. Сярэдняя, Людміла, жыве ў Мётчы, і ўжо шмат год працуе дарэктарам Мётчанскага СДК. Малодшая, Вера, па адукацыі выкладчык-філолаг, працавала спецыялістам Барасаўскага раённага аддзела адукацыі, а затым перайшла на пасаду намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце саўгаса-камбіната «Старабарысаўскі».

Калі Уладзімір Антонавіч пайшаў на пенсію, Марыя Ціханаўна працягвала нялёгкую працу на трактары адна. Немагчыма нават уявіць сабе, колькі тысяч гектараў культывацыі, ворыва, догляду пасеваў і пасадак, жніва і ўборкі льну і карняплодаў на рахунку гэтай прыгожай, вясёлай, добразычлівай жанчыны! А дом яе па - ранейшаму заставаўся ўтульным, прыгожым і гасцінным. А ў хляве не пераводзіліся кароўкі і цяляткі, парсючкі і куркі з пеўнікамі. Адкуль толькі сілы, здаецца, бяруцца ў чалавека?

Але яшчэ больш на яе рахунку добрых спраў, якія зрабіла Марыя Ціханаўна для людзей. У час свайго дэпутацтва ды і зараз яна выкарыстоўвае ўсе свае даўнія сувязі і дапамагае суседзям і вяскоўцам ва ўсіх праблемах, з якімі людзі звяртаюцца да яе.

Многія здзіўляюцца, што, маючы такі аўтарытэт у раёне і вобласці, былы дэпутат Вярхоўнага Савета не пераехала жыць са сваёй аддаленай маленькай Ярцаўкі не тое што ў раённы цэнтр, а нават у цэнтр саўгаса, не прамяняла свой вясковы дом на добраўпарадкаваную кватэру. Пра яе з любоўю кажуць: «Нашай Ціханаўне пры жыцці трэба помнік паставіць».

А якая таленавітая гэта жанчына! Колькі ведае яна песень, як хораша іх спявае! А якая прыгожая і жартаўлівая яна ў танцах, колькі ведае прыпевак, як дарэчы іх прыпявае! Зараз Марыя Ціханаўна на заслужаным адпачынку. Але рукі яе не адпачываюць ад працы, а душа па-ранейшаму клапоціцца пра родных і сяброў. Гэтая заўсёды маладая жанчына разам з маёй бабуляй і іншымі жанчынамі з навакольных вёсак утварылі некалі спеўны гурт «Мядоцкая талака» і да гэтага часу радуюць людзей даўнімі песнямі: кірмашовымі, вясельнымі, каляднымі, жніўнымі.

Я вельмі люблю слухаць, пра што размаўляўляюць, як спяваюць дзве Марыі – дзве сяброўкі па жыцці і па працы, сяброўкі па нялёгкай вясковай жаночай долі, калі збіраюцца разам. Для мяне мая бабуля Марыя Елісееўна і яе сяброўка Марыя Ціханаўна – прыклад працавітасці, прыклад мацярынства, прыклад сапраўднага сяброўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ